Якія кадры чакаюць на работу рэдактары раённых і абласных газет?

27.12.2017 00:36 **Аўтар: Алена Кравец (/be/author/alena-kravec)** **Грамадства (/be/gramadstva), Медыя (/be/medyya), Дыялог (/be/dyyalog)**

Як развівацца рэгіянальным сродкам масавай інфармацыі: ісці па шляху ўзбуйнення і аб'яднання ці захоўваць аўтаномнасць? Як канкурыраваць з інтэрнэт-рэсурсамі і ўдасканальваць уласныя сайты? Якім павінна быць узаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады і якія кадры чакаюць на работу галоўныя рэдактары раённых і абласных газет? Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі ўдзельнікі круглага стала, арганізаванага Міністэрствам інфармацыі і Выдавецкім домам «Звязда».

(ht



Трэба адзначыць, што такой сустрэчы папярэднічалі абласныя семінары рэгіянальных СМІ, ініцыяваныя Адміністрацыяй Прэзідэнта, дзе прадстаўнікі рэдакцый і тэлекампаній дзяліліся сваімі поглядамі і вывучалі вопыт калег. Цяпер кіраўнікі рэгіянальных СМІ абмеркавалі надзённыя пытанні на рэспубліканскім узроўні і выказалі свае прапановы па ўдасканаленні дзейнасці.



— Рэгіянальныя СМІ вельмі блізкія да падпісчыка, з мясцовымі навінамі яны прыходзяць бадай што ў кожны дом. Іх роля надзвычай важная падчас выбарчых кампаній, — адзначыла **начальнік інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Таццяна Хмель.** — У той жа час падпісчык сёння вельмі патрабавальны, а інфармацыйная прастора развіваецца імкліва. Таму сродкі масавай інфармацыі таксама мяняюцца.

Сёння яны становяцца мультымедыйнымі, калі адначасова падаюць інфармацыю ў розных формах — тэкставай, аўдыяльнай, а таксама фота- і відэаінфармацыю. СМІ ператвараюцца ў шматканальныя крыніцы інфармацыі — перадаюць яе не толькі традыцыйным спосабам, але і праз вэб-сайты, суполкі ў сацсетках. Рэгіянальныя СМІ сёння павінны не абмяжоўвацца інфармацыяй з месцаў, а вырабляць рэспубліканскі кантэнт. А журналіст у сённяшніх рэаліях павінен быць універсальным — успрымаць і апрацоўваць розную тэматычную інфармацыю, а таксама перадаваць яе з дапамогай сучасных сродкаў.

(h



На пытанні падрыхтоўкі кадраў звярнуў увагу і **начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Генадзь Ягораў**. Ён падкрэсліў, што прафесіяналізм журналістаў адыгрывае важную ролю ў аб'ектыўнасці асвятлення праблем. А ад тэндэнцыйных матэрыялаў нясе страты як аўтарытэт выдання, так і аўтарытэт выканаўчай улады. Таццяна Хмель паведаміла, што сёння спецыялістаў для СМІ, акрамя інстытута журналістыкі БДУ, рыхтуюць дзяржаўныя ўніверсітэты ў Гродне, Брэсце і Магілёве. І з імі існуе пастаянная зваротная сувязь. Студэнты практыкуюцца ў розных рэдакцыях, дзе створана сістэма настаўніцтва.



Галоўны рэдактар дзяржынскай раённай газеты «Узвышша» Ларыса Коршун паведаміла, што праблему з кадрамі яны вырашылі па-свойму: пры рэдакцыі стварылі «Клуб юных журналістаў», куды запрашаюць старэйшых школьнікаў.

— Сёння нават у раённай газеце журналіст павінен быць універсальным — ён мусіць і пісаць, і фатаграфаваць, і здымаць для тэлебачання, і запісваць радыёперадачы, і працаваць з сайтам, — расказала Ларыса Коршун. — Дарэчы, наш сайт за непрацяглы час атрымаў вялікую папулярнасць у рэгіёне. Зараз у нас у сярэднім 1700 унікальных наведвальнікаў у суткі. Па гэтым паказчыку мы займаем другое месца ў вобласці пасля Барысаўскага раёна. І ў нас ёсць рэзерв, каб гэта лічба вырасла да 3 тысяч. На сайце размяшчаем 13—15 навін штодзень, прычым яны адрозніваюцца ад тых, што друкуюцца ў газеце. Мэтавая аўдыторыя сайта — людзі ад 24 да 49 гадоў, самая плацежаздольная катэгорыя. А вось у друкаванай версіі, як правіла, падпісчыкі больш сталага ўзросту. Праз сайт імкнёмся рэкламаваць газету, і гэта спрацоўвае.

(h



А вось **Ігар Сяргееў, галоўны рэдактар рэчыцкай раённай газеты «Дняпровец»**, якая ў хуткім часе адзначыць свой 100-гадовы юбілей, упэўнены, што інтэрнэт адцягвае падпісчыка. У выданні самастойна распрацавалі сайт, і штодзень яго наведвае 4,5 тысячы ўнікальных наведвальнікаў. Старонку газеты ў «УКантакце» чытае 15 тысяч чалавек, у «Аднакласніках» — 6,5 тысячы. Тым не менш пакуль сайт не прыносіць прыбытку, а наадварот стратны.

— Інтэрнэт успрымаецца як бясплатны сродак атрымання інфармацыі. Але трэба памятаць, што ўсе друкаваныя СМІ выконваюць найперш ідэалагічную функцыю, а затым інфармацыйную і забаўляльную, — выказаў меркаванне Ігар Сяргееў. — Таму ўсе зацікаўленыя структуры павінны аб'яднаць намаганні, каб падтрымаць нас. Уплыў друкаваных СМІ ў інфармацыйнай прасторы не павінен слабець.

На думку Ігара Сяргеева, такія выданні застануцца і будуць існаваць. І прывёў прыклад Швецыі, дзе планамерна падтрымліваюць газеты.

— Асноўная аўдыторыя перыёдыкі там — людзі ва ўзросце 50 гадоў і старэйшыя. Гэта той жыццёвы перыяд, калі выплачаны крэдыты на жыллё і зроблены нейкія накапленні. Адзін са спосабаў іх прымнажэння — набыць акцыі адных прадпрыемстваў і прадаць акцыі іншых. У той жа час суб'екты гаспадарання абавязаныя размяшчаць справаздачы аб фінансавай дзейнасці ў мясцовых газетах. Такім чынам чытачы атрымліваюць карысную для сябе інфармацыю, аналізуюць і прымаюць рашэнні, якія акцыі ім набыць, ад якіх пазбавіцца. Такое рашэнне на дзяржаўным узроўні прынята, каб падтрымаць газеты. У выніку выйграюць усе — і ўлада, і газеты, і іх чытачы, — падзяліўся Ігар Сяргееў.

Ён расказаў, што ў Швецыі рэгіянальныя газеты належаць холдынгам. Прычым большасць выданняў вядуць свой летапіс з пазамінулага стагоддзя. Зразумела, што за гэты час у іх змяніўся шэраг уласнікаў, аднак назва засталася.

Аб рабоце ў складзе айчыннага холдынга расказала і Ларыса Коршун. Каля паўгода таму дзяржынская раённая газета «Узвышша» была аб'яднаная ў холдынг з абласным выданнем «Мінская праўда». Галоўны рэдактар падкрэсліла, што станоўчых момантаў у такім узбуйненні шмат.

— Сёння нашы чытачы атрымліваюць дзве газеты — раённую і абласную. Прычым «Узвышша» выйшла на каляровы друк, і падпісчыкі атрымалі больш якасны прадукт. Фармат раённай газеты быў залішне кансерватыўны, і «Мінская праўда» падштурхнула нас да развіцця — і ў інфармацыйным напаўненні, і ў дызайне мы сталі лепшыя. А абласная газета праз нас наблізілася да чытача. Прычым мы меркавалі, што частка падпісчыкаў будзе задаволеная, а нехта і негатыўна ўспрыме аб'яднанне, аднак адмоўных водгукаў не атрымалі. Тыраж нашай газеты не зменшыўся, нягледзячы на тое, што кошт, хоць і нязначна, але павялічыўся. Вырасла і заработная плата ў супрацоўнікаў рэдакцыі. Будзем развівацца далей: працаваць над сайтам і ствараць сваю рэкламную газету, якая будзе распаўсюджвацца на тэрыторыі Дзяржынскага раёна, — паабяцала Ларыса Коршун.

(h



Аб яшчэ адным варыянце ўдасканалення работы рэгіянальных СМІ — кластары — расказаў **галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Юрый Касіцкі.**

— Сумесна з кафедрай журналістыкі Гродзенскага ўніверсітэта быў створаны медыйна-інфармацыйны кластар на базе «Гродзенскай праўды». Карысць ад кластара атрымалі найперш супрацоўнікі раённых газет, якія праходзяць стажыроўкі і майстар-класы па розных кірунках, пачынаючы ад вёрсткі, тэматычнага напаўнення газеты да прасоўвання сайта ў сеціве. Акрамя гэтага, паміж раённымі і абласной газетай наладжаны пэўны інфармацыйны абмен. У «Гродзенскай праўдзе» друкуюцца навіны з самых розных куткоў вобласці. Раённыя газеты ў сваю чаргу атрымліваюць карысную інфармацыю з усёй Гродзеншчыны.

Наведваюць рэгіянальныя журналісты і «Школу журналістыкі «Майстэрня BY-RU», дзе прафесійныя сакрэты раскрываюць расійскія карэспандэнты, рэдактары, менеджары СМІ і PR-спецыялісты. А таксама павышаюць кваліфікацыю ў творчай майстэрні на базе тэлерадыёкампаніі «Гродна Плюс». Усё гэта спрыяе росту прафесійнага майстэрства.



— Уніфікацыя, глабалізацыя — той шлях, па якім павінны ісці сучасныя сродкі масавай інфармацыі, — пагадзіўся **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел Сухарукаў**. — Ён мае перспектыву, бо такія выданні выйграюць у плане ўзаемнага інфармацыйнага абмену, мабільнасці, падрыхтоўкі кадраў.

(h



Галоўны рэдактар брэсцкай абласной газеты «Зара» Аляксандр Лагвіновіч засяродзіў увагу на тым, што абласной газеце, у адрозненне ад рэспубліканскай і раённай, складаней дайсці да падпісчыка.

— Сёння не кожная сям'я можа дазволіць сабе выпісваць і раённую, і абласную газету. Мы апынуліся ў няпростых умовах канкурэнцыі. Тым не менш гэта прымушае нас развівацца. У газеце, напрыклад, з'явілася рубрыка «Рэгіён». Людзям цікава не толькі тое, што адбываецца побач, але і тое, як жывуць суседзі. Мы пачалі друкаваць цікавыя навіны з Гродзенскай вобласці, і бачым, што чытачам гэта ідэя прыйшлася даспадобы. У барацьбе за падпісчыка мы стварылі асобны падпісны індэкс для прадпрыемстваў, якія могуць падпісаць сваіх работнікаў. Але тут нярэдка нам прыходзіцца канкурыраваць з галіновымі выданнямі.

Аляксандр Лагвіновіч падкрэсліў, што з імклівым развіццём інфармацыйнай прасторы не толькі рэдактары і журналісты павінны быць асобамі публічнымі. Датычыцца гэта і прадстаўнікоў мясцовай улады. Яны мусяць быць гатовымі аператыўна даць неабходную інфармацыю, своечасова адрэагаваць на праблемнае пытанне каментарыем на тэлебачанні, радыё ці ў газеце.

— Мэта папярэдніх семінараў рэгіянальных СМІ і сённяшняга мерапрыемства — пачуць голас рэгіёнаў, атрымаць прапановы для далейшага ўдасканалення работы перыядычных выданняў, — падкрэсліла, падводзячы вынік круглага стала, Таццяна Хмель. — Мы прыйшлі да высновы, што разрозненыя структуры сёння, на жаль, прайграюць тым, хто пайшоў па шляху ўзбуйнення. І інфармацыйныя кластары, і медыйныя холдынгі дэманструюць сваю выніковую дзейнасць і ў эканамічным плане, і выйграюць у барацьбе за чытача.

Усе прапановы ад прадстаўнікоў рэгіянальных СМІ будуць разгледжаныя і прааналізаваныя ў Міністэрстве інфармацыі, далейшая стратэгія развіцця будзе будавацца з іх улікам.

Алена КРАВЕЦ

kravets@zviazda.by (mailto:kravets@zviazda.by)

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

Загаловак у газеце: Пачуць голас рэгіёнаў

Чытайце таксама

Брэсцкая абласная газета «Заря» адсвяткавала 85-гадовы юбілей (/be/news/20241020/1729425000-bresckaya-ablasnaya-gazeta-zarya-adsvyatkavala-85-gadovy-yubiley)

Марат Маркаў: Калі палічым, што ўжо зрабілі дастаткова, прайграем (/be/news/20241020/1729405450-marat-markau-kali-palichym-shto-uzho-zrabili-dastatkova-praygraem)

У Пекіне абмяркуюць дзейнасць у сферы тэле- і радыёвяшчання (/be/news/20241007/1728293781-u-pekine-abmyarkuyuc-dzeynasc-u-sfery-tele-i-radyyovyashchannya)

Сацыёлаг назваў пяць тэндэнцый у інфармацыйным полі Беларусі (/be/news/20240923/1727095284-sacyyolag-nazvau-pyac-tendencyy-u-infarmacyynym-poli-belarusi)

Хто казаў, што газета жыве адзін дзень? (/be/news/20240917/1726581246-hto-kazau-shto-gazeta-zhyve-adzin-dzen)

Тэгі:

CMI (/be/tags/smi) | медыя (/be/tags/medyya) | журналістыка (/be/tags/zhurnalistyka) | газета (/be/tags/gazeta) | рэгіянальная прэса (/be/tags/regiyanalnaya-presa-0) | рэгіянальныя СМІ (/be/tags/regiyanalnyya-smi) | «Звязда» (/be/tags/zvyazda-1) | Павел Сухарукаў (/be/tags/pavel-suharukau)

5520 праглядаў Русский (/ru/news/20171227/1514357097-kakie-kadry-zhdut-na-rabotu-redaktory-rayonnyh-i-oblastnyh-gazet)
Друкаваная версія (/be/print/122839)

Падзяліцца:

(https://vk.com/share.php?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20171226%2F1514306322-yak-razviv
(https://connect.ok.ru/offer?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20171226%2F1514306322-yak-razvi
(https://twitter.com/intent/tweet?text=%D0%AF%D0%BA%D1%96%D1%8F%20%D0%BA%D0%B0%D0%B4%D1%80%
(viber://forward?text=%D0%AF%D0%BA%D1%96%D1%8F%20%D0%BA%D0%B0%D0%B4%D1%80%D1%8B%20%
(https://t.me/share/url?url=https%3A%2F%2Fzviazda.by%2Fbe%2Fnews%2F20171226%2F1514306322-yak-razvivacc

Навіны | Папулярнае

17:13 Урад адобрыў праект навукова-тэхнічнай праграмы Саюзнай дзяржавы «Саюз-Біямембраны» (/be/news/20241022/1729581518-urad-adobryu-praekt-navukova-tehnichnay-pragramy-sayuznay-dzyarzhavy-sayuz)

16:51 Са студзеня 2025 года змяняюцца памеры нарматываў на фінансаванне паслуг ва ўстановах сацабслугоўвання (/be/news/20241022/1729596873-sa-studzenya-2025-goda-zmyanyayucca-pamery-narmatyvau-na-finansavanne)

16:35 МАРГ устанавіў, які сэрвіс таксі займае дамінуючае становішча ў сталіцы (/be/news/20241022/1729596645-marg-ustanaviu-yaki-servis-taksi-zaymae-daminuyuchae-stanovishcha-u-stalicy)

16:05 Два чалавекі пацярпелі ў ДТЗ у Мастоўскім раёне (/be/news/20241022/1729581014-dva-chalaveki-pacyarpeli-u-dtz-u-mastouskim-rayone)

15:52 Іванец: Мы будзем развіваць узаемадзеянне дзіцячага тэхнапарка з рэальным сектарам эканомікі (/be/news/20241022/1729596396-ivanec-my-budzem-razviyac-uzaemadzeyanne-dzicyachaga-tehnaparka-z-realnym)

УСЕ НАВІНЫ (/BE/NEWS)

Іншыя матэрыялы аўтара

Сталічныя школьнікі прымералі на сябе медыцынскія прафесіі (/be/news/20241022/1729603272-stalichnyya-shkolniki-prymerali-na-syabe-medycynskiya-prafesii)

Брэсцкая абласная клінічная бальніца будуе высокатэхналагічны корпус (/be/news/20241022/1729603150-bresckaya-ablasnaya-klinichnaya-balnica-budue-vysokatehnalagichny-korpus)

Чым небяспечная воспа малпаў? (/be/news/20241022/1729602949-chym-nebyaspechnaya-vospa-malpau)

Што важна для здаровай псіхікі? (/be/news/20241015/1728995738-shto-vazhna-dlya-zdarovay-psihiki)

У Мінску ўзнагародзілі найлепшых медыкаў, якія займаюцца захаваннем цяжарнасці (/be/news/20241018/1729263862-u-minsku-uznagarodzili-naylepshyh-medykau-yakiya-zaymayucca-zahavannem)

(https://declarant.by/ru/)

Выбар рэдакцыі

Грамадства (/be/gramadstva)

(/be/news/20241021/1729521436-tysyachy-garachyh-sercau-udzelnikau-marafonu-adzinstva)

Тысячы гарачых сэрцаў удзельнікаў «Марафону адзінства» (/be/news/20241021/1729521436-tysyachy-garachyh-sercau-udzelnikau-marafonu-adzinstva)

«Ёсць чым ганарыцца, што захоўваць і дзеля чаго змагацца!»

0 85

Памяць (/be/pamyac)

(/be/news/20241021/1729517345-zbirayce-i-zahouvayce-dlya-gistoryi)

«Збірайце і захоўвайце для гісторыі...». Музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 80 гадоў (/be/news/20241021/1729517345-zbirayce-i-zahouvayce-dlya-gistoryi)

80 гадоў таму Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўпершыню адчыніў свае дзверы для наведвальнікаў.

0 91

Грамадства (/be/gramadstva)

(/be/news/20241021/1729515304-ad-glybokaga-da-drui-praz-braslau)

Ад Глыбокага да Друі праз Браслаў (/be/news/20241021/1729515304-ad-glybokaga-da-drui-praz-braslau)

Прыгажосць і цікавосткі беларускага Паазер'я.

0 85

Грамадства (/be/gramadstva)

(/be/news/20241015/1729005837-na-uik-end-pa-zhyvyya-vitaminy)

На ўік-энд — па «жывыя вітаміны» (/be/news/20241015/1729005837-na-uik-end-pa-zhyvyya-vitaminy)

Традыцыйны восеньскі кірмаш у Гомелі.

(https://declarant.by/ru/)

0 347

Нашы партнёры:

(https://center.gov.by/) (http://mininform.gov.by/ru/) (http://pravo.by/) (http://wwv

ЗВЯЗДА (/)

ПАДПІСКА (/BE/SUBSCRIPTION)

© 1998—2024 Усе правы належаць рэдакцыі РВУ “Выдавецкі дом “Звязда”.
Пры выкарыстанні публікацый сайта актыўная гіперспасылка на крыніцу і аўтара абавязкова.

Газета "Звязда" (/be/edition)
Рэклама (/be/advertising)
Праекты (/be/projects)
Архіў (/be/pdf)
Экстрэмісцкія матэрыялы (/be/page/respublikanski-spis-ekstremisckih-materyyalau)

Палітыка (/be/palityka)
Эканоміка (/be/ekanomika)
Грамадства (/be/gramadstva)
У свеце (/be/u-svece)
Культура (/be/kultura)
Калейдаскоп (/be/kaleydaskop)
Спорт (/be/sport)
Нашы выданні (http://zviazda.by/be/about)
Кнігі (http://zviazda.by/be/page/bibliyateka-zvyazdy)

8 896
5 804
5 512
(https://metrika.yandex.by/stat/?id=37842935&from=informer)

(https://vk.com/zviazda) (https://www.instagram.com/zviazda.by/)
(https://t.me/zviazda_online)